стр. 8

Аўтар і вядучая рубрыкі — Надзея БУНЦЭВІЧ

# Рэхавыя спевы




**Беларуская харавая музыка настойліва імкнецца быць наперадзе нашай нацыянальнай культуры. Чарговы таму доказ — нядаўні Першы Беларускі фестываль-конкурс нацыянальнай харавой музыкі "Рэха". Яго ініцыятарам выступіў Творчы цэнтр "BelArtSound" Беларускага саюза музычных дзеячаў. А двухдзённае свята, што прайшло ў залах ДМШ № 10 імя Я.Глебава і Клуба імя Ф.Дзяржынскага, сабрала больш як 30 аматарскіх і прафесійных калектываў з розных куткоў краіны, якія спявалі творы нашых кампазітараў.**



Лепшыя выканаўцы вызначаліся па пяці намінацыях: хоры аматарскія змяшаныя, аматарскія аднародныя, дзіцячыя малодшага ўзросту, дзіцячаюнацкія і, нарэшце, вакальныя ансамблі. Дзесьці першыя прэміі дзяліліся, дзесьці — увогуле не прысуджаліся. Гран-пры атрымаў Народны хор ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і працы г. Барысава на чале з Валянцінай Георгіу.

— Фестываль-конкурс, — падзялілася ўражаннямі старшыня журы, дацэнт кафедры харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Ларыса Шымановіч, — сапраўды знайшоў "рэха" ў душах усіх удзельнікаў і слухачоў. Але ён высвеціў і шэраг праблем, што вядуць свой пачатак ажно са спеваў у дзіцячых садках. Вельмі хацелася б, каб гэтае свята стала стымулам для больш цесных сувязей паміж кампазітарамі і харавымі калектывамі. Слушна кажуць: заспявае школа — заспявае народ. А спеўны народ, якім і былі беларусы на працягу стагоддзяў, — гэта шлях да развіцця духоўнасці...

Ну, а дадатковым доказам замежнага прызнання нашых кампазітарска-выканальніцкіх заваёў стаў чарговы нумар аднаго з аўтарытэтных бельгійскіх часопісаў "Міжнародны харавы бюлетэнь", прысвечаны харавой культуры Беларусі і Польшчы. Дый на нядаўні філарманічны вечар памяці народнага артыста СССР, прафесара Віктара Роўды з'ехаліся не толькі яго вучні з розных куткоў нашай краіны (усяго іх, дарэчы, больш за 800), але і расійскія госці: прафесар Маскоўскай кансерваторыі Аляксей Руднеўскі выступіў адным з арганізатараў канцэрта і яго дырыжорам, а кампазітар Уладзіслаў Агафоннікаў прысвяціў знакаміта му Маэстра шэраг сваіх твораў.

**Фота Юрыя ІВАНОВА**
**На здымках: народная харавая капэла БНТУ; ансамбль народнай музыкі "Валачобнікі" БДУКіМ.**



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ